Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-09-12




Пра Брэсцкую Біблію чытайце на стар. 2

# Дзень народзінаў Брэсцкай Бібліі

***Чытачы могуць узгадаць, што некалькі месяцаў таму «Краязнаўчая газета» ўжо пісала пра 450-годдзе Брэсцкай Бібліі, якое сёлета адзначаецца. Сёння ў нас ёсць магчымасць вярнуцца да гэтай тэмы, бо якраз 4 верасня 1563 года і ўбачыла свет Брэсцкая Біблія. А святкаванне юбілею кнігі адбылося ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Таксама спецыяльна да імпрэзы супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі выстаўку «450-годдзе Брэсцкай Бібліі» і сабралі даследаванні айчынных і замежных навукоўцаў, што тычацца гэтага выдання.***



*Выступаюць А. Цітавец і Г. Галенчанка*

Але перш, чым пачаць гаворку пра імяніннiцу (менавіта так кнігу называлі пад час імпрэзы супрацоўнікі бібліятэкі), варта колькі словаў сказаць пра фундатара гэтага выдання – Мікалая Радзівіла Чорнага. У Вялікім Княстве Літоўскім ён займаў дзве вышэйшыя пасады – канцлера і віленскага ваяводы, і ў свой час яго называлі некаранаваным каралём ВКЛ. Менавіта дзякуючы падтрымцы гэтай асобы была выдадзеная Біблія.

Больш падрабязна пра «адзін з найкаштоўнейшых дыяментаў у скарбонцы аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў» слухачам расказала Алена Цітавец, загадчыца сектара кнігазнаўства гэтага аддзела. Як высветлілася, на яе старонках захаваліся рукапісныя пазнакі, а таксама штампы. Адзін з іх – штамп Бібліятэкі Віленскага евангеліцка-рэфармацкага сінода, які быў заснаваны Мікалаем Радзівілам Чорным. Магчыма, наш асобнік Бібліі трапіў туды ўжо пасля яго смерці.

Варта адзначыць, што кола выступоўцаў пад час імпрэзы было досыць шырокім. Пра мастацкія вартасці выдання расказала слухачам дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ Наталля Трыфанава. Дарэчы, навукоўцы лічаць, што да сённяшняга часу захавалася каля сарака асобнікаў Брэсцкай Бібліі. Але ёсць і іншае меркаванне, згодна з якім гэтую лічбу можна павялічыць прыкладна ўдвая. Пад час імпрэзы з гэтым згадзілася і Людміла Іванова, вядучы палеограф Нацыянальнага гістарычнага архіва. Сваю думку яна абгрунтавала тым, што ў XVI стагоддзі Брэсцкая Біблія была вельмі распаўсюджаным выданнем, а яе асобнік знаходзіўся ў кожным пратэстанцкім зборы Вялікага Княства Літоўскага.

Гісторык і кнігазнаўца Георгій Галенчанка назваў Брэсцкую Біблію неператўзыдзеным шэдаўрам беларускага кнігадрукавання. Адзначыў ён і тое, што ва Усходняй Еўропе Брэсцкая Біблія была першай поўнай Бібліяй – то бок, складалася са Старога і Новага Запаветаў. Адным словам, у гэтай сувязі нам ёсць чым ганарыцца. Аднак гісторык не абмінуў увагай і тое, што на сённяшні дзень асобнік кнігі, які знаходзіцца ў Беларусі, яшчэ мала вывучаны. Могуць спатрэбіцца даследаванні не аднаго дзясятка навукоўцаў, каб поўнасцю раскрыць таямніцы Брэсцкай Бібліі, якія, відавочна, яшчэ ёсць. «Жніва многа, але жняцоў мала», – так, амаль дакладнай біблейскай цытатай, скончыў імпрэзу Георгій Галенчанка.

*Ніна КАЗЛЕНЯ*
*Фота аўтара*

Ніна Казленя. Дзень народзінаў Брэсцкай Бібліі